*Приветствую вас, мои друзья.*

*Вот и дождались мы последнего осеннего месяца. Месяца, когда солнышко уже совсем обленилось и «ходит» по небу совсем низко, дни стали совсем короткими и мрачными, оголили свои ветки деревья и из-за этого стали совсем непривлекательными, а небо, затянутое рваными серыми тучами, плачет на землю дождём….*

*Но без всего этого не было бы новой весны, новых листьев, радости от голубизны небес и вновь возрождённого солнышка.*

*Так что надо потерпеть… Ведь, как известно, "у природы нет плохой погоды".*

А что же у нас с юбилярами? Да всё в порядке! В этом ненастном месяце умудрились появиться на свет два замечательных белорусских писателя – Максим Лужанин и Михась Лыньков.

И ещё одного юбилея мы не можем пропустить – 90- летие со дня рождения композитора Александры Пахмутовой, ведь без её музыки огромное количество прекрасных поэтических строк осталось бы только на бумаге….



***Максім Лужанін*** (сапраўднае імя Аляксандр Амвросьевіч Каратай) нарадзіўся **2 лістапада** 1909 г. у вёсцы Прусы Слуцкага павета Мінскай губерні ў сялянскай сям'і. **110-ую гадавіну пісменніка і будзем адзначаць у гэты дзень.**

Яму было наканавана доўгае і плённае жыццё, вельмі нялёгкае, але багатае на падзеі.

У 1924 годзе Алесь паступіў у Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум. У 1925 г. былі надрукаваны першыя вершы М. Лужаніна.

У 1928 г. выйшла з друку яго першая кніга «Крокі», якая атрымала станоўчы водгук Янкі Купалы і Цішкі Гартнага. У тым жа годзе ён стаў студэнтам літаратурна-лінгвістычнага факультэта БДУ, дзе правучыўся да 1930 г. Са студзеня па кастрычнік 1931 г. працаваў сакратаром часопіса «Узвышша», у канцы 1931—33 гг. — рэдактарам на Беларускім радыё.

23 красавіка 1933 г. М. Лужанін быў арыштаваны, а 10 жніўня незаслужана асуджаны на два гады пазбаўлення волі на палітычнай глебе. Пакаранне адбываў у Марыінску Кемераўскай вобласці, рэабілітаваны ў 1956 г.

На творчасць Лужаніна асаблівы ўплыў аказаў Уладзімір Маякоўскі. Малады паэт імкнуўся прысутнічаць на выступленнях знакамітага Маякоўскага. Нязвыклая рытмічная карціна вершаў, іх рэвалюцыйна-урбаністычная тэматыка захапілі беларускага паэта і павялі ў гэтым жа кірунку.

Трэба адзначыць, што да таго ж перыяду творчасці М. Лужаніна адносяцца высакаякасныя, тонкія ўзоры інтымнай лірыкі, філасофскія вершы і пейзажна-бытавая лірыка.

З 1935 г. М. Лужанін працаваў рэдактарам-арганізатарам Галоўнай рэдакцыі літаратуры па машынабудаванні ў Маскве. У жніўні 1941 г. прызваны ў Савецкую Армію, скончыў Падольскае пяхотнае вучылішча (1942 г.), удзельнік баёў пад Масквой і Сталінградам. Пасля дэмабілізацыі (1944 г.) загадваў аддзелам культуры ў газеце «Звязда», працаваў адказным сакратаром часопіса «Вожык», рэферэнтам АН БССР (сакратаром Якуба Коласа).

З 1959 г. па 1971 год М. Лужанін працаваў на студыі «Беларусьфільм» (член сцэнарнай калегіі, у 1967—1972 гг. галоўны рэдактар).

Лужанін - аўтар шматлікіх вершаваных зборнікаў. Працаваў і ў галіне прозы, а таксама крытыкі.

Працаздольнасць М. Лужаніна ўражвае. Акрамя паэзіі і прозы ён займаецца перакладамі. На беларускую мову пераклаў «Жыццё Кліма Самгіна» М.Горкага (1938), «Гора ад розуму» А.Грыбаедава (1949), «Вечары на хутары ля Дзіканькі» (1950) і «Выбраныя творы» М.Гогаля (1952). «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву» А.Радзішчава (1951), «Маладую гвардыю» А.Фадзеева (1953), «Яны змагаліся за радзіму» М.Шолахава (1975), «Пераяслаўскую Раду» Н.Рыбака (1954-1955), паасобныя творы А.Пушкіна, А.Міцкевіча, М.Някрасава, І.Буніна, У.Сыракомлі, Ю.Тувіма, У.Маякоўскага, Я.Смелякова і інш.

Асобная старонка ў біяграфіі пісьменніка - гэта яго знаёмства з Я. Коласам. М. Лужанін шмат гадоў правёў побач з народным песняром. У выніку склалася цікавая біяграфічная кніга "Колас расказвае пра сябе", за якую ў 1965 г. М. Лужанін атрымаў літаратурную прэмію імя Я. Коласа.

Лужаніну належаць сцэнарыі мастацкага фільма «Паўлінка» (па аднайменнай п'есе Я. Купалы, паст. у 1951), дакументальнага фільма "Народны паэт" пра Я. Коласа (1952 г.). Сумесна з Аркадзем Куляшовым напісаў кінасцэнарый да мастацкага фільма "Першыя выпрабаванні", знятага па матывах рамана Я. Коласа "На ростанях".

Пісьменніку прысвечаны дакументальны фільм «Назавершаная хата» (1993).

Максім Лужанін - заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1969), заслужаны дзеяч культуры Польскай Народнай Рэспублікі (1975), лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа 1965 г. за аповесць-эсэ «Колас расказвае пра сябе» (1964). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Дружбы народаў, Айчыннай вайны II ступені і медалямі. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР (1969).

Памёр Максім Лужанін 13 кастрычніка 2001 года ў Мінску.




***30 лістапада мы адзначаем 120 гадоў з дня нараджэння Міхася Лынькова.***

Калі спытаць у нашых суайчыннікаў, які самы вядомы вобраз беларускай літаратуры, найбольшая верагоднасць, што вам адкажуць: "Міколка-паравоз" - герой аповесці народнага пісьменніка Беларусі Міхася Лынькова. Вобраз яркі і вядомы, нягледзячы на тое, што створаны шмат гадоў таму і з таго часу кардынальна памяняліся каштоўнасці і аўтарытэты і забылася тое, што лічылася створаным на стагоддзі. Магчыма, сам пісьменнік здзівіўся б такой з'яве, бо ён напісаў столькі аб'ёмных раманаў, а чытацкую ўвагу прыцягнуў гарэзны Міколка, дзіцё беларускай чыгункі.

Зрэшты, у сусветнай літаратуры выпадак тыповы: Ханс Крысціян Андэрсан вельмі незадаволены быў, што яго казкі - больш паспяховыя, чым яго ж павучальныя раманы. Можна прыгадаць і Конана Дойла…

Шмат у чым Міколку–паравоза Міхась Лынькоў спісваў з сябе.

Ён нарадзіўся 30 лістапада 1899 года ў вёсцы Зазыбы Віцебскага павета ў сям'і чыгуначніка. Пераязджалі са станцыі на станцыю. Побыт сям'і даволі дакладна апісаны ў аповесці: «Вы не бачылі Міколкавай хаты? Яна вунь у самым тупіку, дзе заканчваюцца станцыенныя лініі, дзе безліч стрэлак, дзе стаяць недалёка прыгожыя семафоры, дзе ў бязмежныя прасторы працягнуліся, пабеглі бліскучыя рэйкі».

Дарэчы, Міколка зарабіў сваю мянушку тым, што любіў пераймаць гукі паравоза.

Будучы пісьменнік пайшоў у школу ў вёсцы Старое Сяло пад Рагачовам, дзе бацька атрымаў пасаду пуцявога обходчыка. Хлопчык вучыўся так добра, што яго ўзнагародзілі кнігай Гогаля «Вечары на хутары блізу Дзіканькі». Няма сумнення, што кніга была прачытана ад вокладкі да вокладкі і паўплывала на літаратурны густ будучага пісьменніка.

Лынькоў друкавацца з 1919 г. Выступіў у друку з апавяданнямі ў 1926 г. Выдаў зборнікі прозы «Апавяданні» (1927), «Гой» (1929), «Андрэй Лятун», «Апошні зверыядавец» (абодва — 1930), «На вялікай хвалі» (1934), «Баян» (1935), «Сустрэчы» (1940), «Астап» (1944) і інш. Аўтар рамана «На чырвоных лядах» (1934), рамана-эпапеі ў 4 кн. «Векапомныя дні» (1958, 2-е перапрац. выд. —1969). Напісаў нарыс «Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў» (1944). Аўтар кніг для дзяцей «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1937), «Міколка-паравоз» (1937), «Янка-парашутыст» (1937), «Ядвісін дуб» (1940) і інш.

Міхась Лынькоў сабраў разнастайныя літаратурныя ўзнагароды: тры ордэна Леніна, тры ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэн Чырвонай Зоркі і шматлікія медалі.

Народным пісьменнікам стаў у 1962-м за таго ж Міколку-паравоза.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968) за раман «Векапомныя дні».

Узначальваў Саюз пісьменнікаў БССР, быў акадэмікам і дырэктарам Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва АН БССР. У спісе работнікаў Беларусі, што прадстаўляюцца да ўзнагароджання ў сувязі з 20-годдзем БССР, Міхась Лынькоў значыцца пад нумарам 3, пасля Купалы і Коласа.

Лепшыя творы пісьменніка з цікавасцю перачытваюцца і сёння.

Памёр Міхась Лынькоў 21 верасня 1975 г., пахаваны на Усходніх могілках Мінска.



***Александра Николаевна Пахмутова*** *— легенда советского и российского композиторского искусства. Она считается одним из самых востребованных композиторов Советского Союза, за что в 1984 году была удостоена звания Народной артистки СССР.*

*Александра Николаевна* ***родилась 9 ноября 1929 года*** *в поселке Бекетовка под Сталинградом (ныне Волгоград). Следовательно, этой неунываемой маленькой девочке (помилуй, Господи!) 90 (!!!!) лет.*

*В три с половиной года она начала играть на фортепиано и сочинять музыку.*

*Училась в Сталинградской музыкальной школе, но начавшаяся в июне 1941 года Великая Отечественная война прервала ее занятия.*

В 1943 году девочка была принята в Центральную музыкальную школу при Московской государственной консерватории, которую окончила в 1948 году.

В 1953 году она окончила Московскую Государственную консерваторию имени П.И. Чайковского, где занималась у композитора профессора Виссариона Шебалина, в 1956 году — аспирантуру.

Работая в разных жанрах, Александра Пахмутова завоевала особую популярность как автор песен. В общей сложности на счету композитора около 400 песен, среди них "Песня о тревожной молодости" (1958), "Геологи" (1959), "Старый клен" (1961), "Орлята учатся летать" (1965), "Нежность" (1966), "Трус не играет в хоккей" (1968), "Мелодия" (1973), "Надежда" (1974), "Беловежская Пуща" (1975), "Как молоды мы были" (1976), "Команда молодости нашей" (1979), "До свиданья, Москва" (1980) и многие другие, без исполнения которых нельзя себе представить ни одну встречу с друзьями. Ведь именно их мы поём у костра или за праздничным столом….

Среди авторов стихов песен Александры Пахмутовой — известные поэты Лев Ошанин, Михаил Матусовский, Евгений Долматовский, Роберт Рождественский и другие..

Александрой Пахмутовой написана музыка к нескольким десяткам фильмов. Среди них такие популярные киноленты, как "Девчата" (1961), "Три тополя на Плющихе" (1967), "Рожденная революцией" (1974-1977).




Пахмутова выпустила несколько десятков авторских грампластинок. Среди них компакт-диск "Как молоды мы были" (1995), диск "Зарево любви" (1996), сборник песен "Звездопад" (2001), а также сборник песен

Александра Пахмутова — народная артистка СССР (1984), Герой Социалистического Труда (1990), лауреат Государственных премий СССР (1975, 1982), премии Ленинского комсомола (1967), премии Союзного государства России и Белоруссии (2004).

Награждена двумя орденами Ленина (1979, 1990), двумя орденами Трудового Красного Знамени (1967, 1971), орденом Дружбы народов (1986), российскими орденами "За заслуги перед Отечеством" III (2014), II (1999) и I (2009) степеней, белорусским орденом Франциска Скорины (2000), орденом преподобной Евфросинии, великой княгини Московской II степени (2008).

*Она является обладателем премии "Овация" (2001), премии "Российский Национальный Олимп" (2004).*

*Именем композитора назван открытый в 1968 году астероид Pakhtutova.*

*В 1976 году именем Александры Пахмутовой была названа и официально зарегистрирована в Планетном центре в городе Цинциннати (США) малая планета №1889 между Марсом и Юпитером, открытая крымскими астрономами.*



*С 1956 года и по сей день Александра Пахмутова замужем за известным российским поэтом-песенником Николаем Добронравовым, в творческом союзе с которым написано большинство песен Пахмутовой.*

***Доброго здоровья, дорогая Александра Николаевна, наше всесоюзное достояние!!!!***

***А с вами, мои добрые читатели, я прощаюсь до зимы.***

***За сим откланиваюсь***

***Ваша Наталия Фёдоровна***